Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява будынка Настаўніцкай Семінарыі. Уверсе, справа, змешчаны надпіс, які зроблены тыпаграфскім шрыфтам чорнага колеру ў 1 радок: «Полоцкъ. Учительская семинарія». На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для адраса і пісьма. Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Гатоўскага К.Ф. На адваротным баку змешчаны надпіс, які зроблены алоўкам сіняга колеру: «23х17».

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, загібы вуглоў, надпіс, плямы. (Ф).

**68. «Полоцкъ. Женская гимназія».**

Кардон тонкі; фотатыпія.

8,5 х 13,8 см

ПИАЗ КП6- 2827/11

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява Ніжне-Пакроўскай вуліцы, уздоўж якой - невялікія дрэвы. Злева - двухпавярховы будынак, за якім відаць купал Богаяўленскай царквы. Уверсе паштоўкі змешчаны надпіс: «Полоцкъ. Женская гимназія», які зроблены шрыфтам чорнага колеру ў 1 радок. На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для адраса і пісьма. Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Гатоўскага К.Ф.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, загібы вуглоў. (Ф).

**2.2 Издатель Цветков Х.Т., г. Москва.**

<u>1914 год (?)</u>

**69. «Полоцкъ. Спасо-Ефросиновскій женскій монастырь».**

Кардон тонкі; фотатыпія, хрома-літаграфія, рукапіс.

9,0 х 13,9 см

ПГКМЗ КП15 - 12435

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку паштоўкі змешчаны выявы будынкаў Спасскага манастыра, р. Палаты, драўлянага моста праз раку. Паштоўка каляровая. На адвароце - паштовыя адзнакі. У ніжнім левым выглу змешчаны надпіс, які зроблены тыпаграфскім шрыфтам карычневага колеру ў тры радкі: «Полоцкъ. / / Спасо-Ефросиновскій // женскій монастырь». Імя выдаўца змешчана ўздоўж левага вертыкальнага зрэзу (шрыфт карычневага колеру, 1 радок). На адвароце - рукапісны надпіс, які зроблены алоўкам фіялетавага колеру. Злева: «Дорогая Эмма! // Мы едемъ сейчасъ / / около Брянска / / эту ночь даже спали / / немного, но проспали / / Смоленскъ, скажи / / какое горе! Мы // ужасно весело живем //...// Елизавета // Ирене». Справа: «Гор. Юрьевъ // ... губ. // Ботаническая ул., № 13 // М-м Э. Миліанъ». На адвароце змешчаны два авальныя штампы ледзь разборліва, 2,7 х 2,5 см, і адзін штамп круглай формы дыяметрам 2,7 см з надпісам: «ЮРЬЕВЪ. 23.4.14».

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, заломы вуглоў, плямы, штампы, надпісы.

***2.3 Выдаўцы «Спб. ОтдЪл О-ва Взаимопомощи Полочанъ», «Т-во Р.Голике и А. Вильборгъ». Фотаздымкі палкоўніка Нікуш- кіна. г. Санкт-Пецярбург.***

1903 год.

**70. «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусЪ».**
Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.
9,2 х 13,9 см
ПИАЗ КП9- 5593/2

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку паштоўкі змешчана выява галоўнага ўвахода ў полацкі кадэцкі корпус. Пад здымкам - белая гарызантальная паласа (1,7 см), на якой тыпаграфскім шрыфтам чорнага колеру, у 2 радкі, змешчаны надпісы: «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусЪ», ніжэй, злева: «По фотогр. Полк. Никушкина», справа: «Изд. Спб. ОтдЪла О-ва Взаимопомощи Полочанъ». На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны толькі для адраса. На правым баку паштоўкі, унізе, змешчаны рукапісны надпіс: «главный вход». На адвароце невялікі малюнак і надпіс: «Главный вход //в Полоцкий Кадетский / / корпус 1 этаж - зал 1-й роты / / 2-»- - спальня 1-й роты / /3 -»- -зал 2 роты // Справа стена городского Собора // (б. Костел)// 1901 - 1909гг». Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Вержбаловіча Б.Г.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўклаць, пацёртасць, страта фрагмента ўнізе паштоўкі - 0,5 х 0,6 см, надпісы. (Ф)

**71. «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусЪ».**
Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.
9,3 х 14,0 см
ПИАЗ КП9- 5593/3

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява спальнага пакоя ў будынку полацкага кадэцкага корпуса. Пакой са скляпеністай столлю і сталчымі ў два рады ля сцен ложкамі. Пад здымкам - белая гарызантальная паласа (1,3 см), на якой тыпаграфскім шрыфтам чорнага колеру, у 2 радкі, змешчаны надпісы: «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусЪ», ніжэй, злева: «По фотогр. Полк. Никушкина», справа: «Изд. Спб. ОтдЪла О-ва Взаимопомощи Полочанъ». На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны

бок паштоўкі прызначаны толькі для адраса. На правым баку, унізе, блакітнага колеру чарнілам, у 1 радок, змешчаны надпісы: «Спальня строевой роты (5,6,7 кл)»; чорным чарнілам ў тры радкі: «Дорогихъ родныхъ с имя-/ /нинницою // 19 13/1 04 г.» (асабісты подпіс Вержбаловіча Б.Г.). На адваротным баку, справа, тры круглыя паштовыя штампы. Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Вержбаловіча Б.Г.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, плямы, месцамі пакамячана. (Ф)

**72. «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусѢ»**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

14,0 х 9,2 см

ПИАЗ КП9- 5593/4

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па вертыкалі. На правым баку, ў белай рамцы, змешчана выява групы хлопчыкаў у форме выхаванцаў полацкага кадэцкага корпуса, без галаўных убораў, якія стаяць паўкругам. У цэнтры - хлопец з аркушам белай паперы ў руках. Пад здымкам - белая гарызантальная паласа (1,3 см), на якой тыпаграфскім шрыфтам чорнага колеру, у 2 радкі, змешчаны надпісы: «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусѢ», ніжэй, злева: «По фотогр. Полк. Никушкина», справа: «Изд. Спб. ОтдѢла О-ва Взаимопомощи Полочанъ». На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паш- тоўкі прызначаны толькі для адраса. На правым баку паштоўкі, унізе, у 2 радкі змешчаны надпіс, які зроблены чарнілам блакітнага колеру: «В одном из классов, г. Нейберг 1й» і рыскай адзначаны выхаванец з паперах у руках. На адваротным баку ў тры радкі: «В одном из / /классов / /в часы отдыха».Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Вержбаловіча Б.Г.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, плямы, месцамі пакамячанасць. (Ф)

**73. «Изъ воспомінаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусѢ.»**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

9,2 х 13,9 см

ПИАЗ КП9 - 5593/5

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява панарамнага здымка г. Полацка з боку р. Зах.Дзвіны. Пад здымкам - белая гарызантальная паласа (1,4 см), на

якой тыпаграфскім шрыфтам чорнага колеру, у 2 радкі, змешчаны надпісы: «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусѢ», ніжэй, злева: «По фотогр. Полк. Никушкина», справа: «Изд. Спб. ОтдѢла О-ва Взаимопомощи Полочанъ». На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны толькі для адраса. На правым баку паштоўкі, унізе, змешчаны надпіс, які зроблены чарнілам блакітнага колеру: «Кирха». На адваротным баку ў 8 радкоў змешчаны надпіс блакітным чарн- ілам : «В центре видно одно из зданий Полоцкого / / кадетского корпуса, расположенных полу- / / кругом около б. костела, переделанного в православную церковь / / Слева лютеранская кирха/ / 3-й этаж - главный зал / / 2-й этаж - спальня 1-й роты // 1 этаж - классы 1-й роты в 1901-1909 гг.». Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Вержбаловіча Б.Г.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўклаць, пацёртасць, загіны вуглоў, плямы, надпісы, на адвароце - плямы ад клею. (Ф)

**74. «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусѢ.»**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

9,2 х 13,9 см

ПИАЗ КП9 - 5593/6

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява ўнутраннага двара полацкага кадэцкага корпуса. Злева - трохпавярховы будынак, справа - ўязная брама. Пад здымкам - белая гарызантальная паласа (1,4 см), на якой тыпаграфскім шрыфтам чорнага колеру, у 2 радкі, змешчаны надпісы: «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусѢ», ніжэй, злева: «По фотогр. Полк. Никушкина», справа: «Изд. Спб. ОтдѢла О-ва Взаимопомощи Полочанъ». На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны толькі для адраса. На правым баку, унізе, у 1 радок змешчаны надпіс, які зроблены сінім чарнілам : «Внутренний двор». На адваротным баку ў 6 радкоў: «Внутренний двор и вход во внут- / / ренний парк, которым пользовались // редко / /1-й этаж - кухни// 2-й - спальня 3-й роты //3-й - спальня 2-й роты. В 1901 - 1909 гг.». Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Вержбаловіча Б.Г.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўклаць, пацёртасць, плямы, на адваротным баку - плямы ад клею, надпісы. (Ф)

**75. «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусЪ.»**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

9,1 х 13,8 см

ПИАЗ КП9 - 5593/7

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява групы кадэтаў, размешчаных на спартыўных снарадах у вялікай зале. Пад здымкам - белая гарызантальная паласа (1,4 см), на якой тыпаграфскім шрыфтам чорнага колеру, у 2 радкі, змешчаны надпісы: «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусЪ», ніжэй, злева: «По фотогр. Полк. Никушкина», справа: «Изд. Спб. ОтдЪла О-ва Взаимопомощи Полочанъ». На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны толькі для адраса. На правым баку, справа ўверсе, чорным чарнілам ў 2 радкі змешчаны надпіс: «Полоцк //19 14/ 1 04 г.». Унізе, чорным чарнілам ў 4 радкі - тэкст пісьма, над якім сінім чарнілам ў 1 радок: «Главный зал, на 3-й этаж». На адваротным баку, у цэнтры, у 4 радкі чорным чарнілам - адрас і імя, ніжэй (дапісана пазней), у 2 радкі: «в 1901 - 1909 гг. //от Яши Будянского, двоюродного моего брата, старше меня на ... года». На адваротным баку тры круглыя паштовыя штампы чорнага колеру. Адзін з г. Дзвінска, два другіх - г. Полацка. Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Вержбаловіча Б.Г.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, драпіны, месцамі пакамячанасць, на адваротным баку сляды ад клею, надпісы. (Ф)

**76. «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусЪ.»**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

9,3 х 13,8 см

ПИАЗ КП9 - 5593/8

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява групы кадэтаў у летняй форме, размешчаных у 2 рады (вид з боку). Пад здымкам - белая гарызантальная паласа (1,7 см), на якой тыпаграфскім шрыфтам чорнага колеру, у 2 радкі, змешчаны надпісы: «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусЪ», ніжэй, злева: «По фотогр. Полк. Никушкина», справа: «Изд. Спб. ОтдЪла О-ва Взаимопомощи Полочанъ». На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны толькі для адраса. На правым баку, унізе, у 1 радок змешчаны надпіс, які зроблены сінім чарнілам: «Во внутреннем парке». На адваротным баку, у 2 радкі, сінім чарнілам:

«Урок гимнастики во внутреннем // парке. До 1901 г.». Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Вержбаловіча Б.Г.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўклаць, пацёртасць, плямы, на адваротным баку - сляды ад клею, надпісы. (Ф)

**77. «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусѢ.»**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

9,2 х 13,9 см

ПИАЗ КП9- 5593/9

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява ўнутраннага двара полацкага кадэцкага корпуса. Злева - трохпавярховы будынак, справа - чатыры шарэнгі кадэтаў. Пад здымкам - белая гарызантальная паласа (1,7 см), на якой тыпаграфскім шрыфтам чорнага колеру, у 2 радкі, змешчаны надпісы: «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусѢ», ніжэй, злева: «По фотогр. Полк. Никушкина», справа: «Изд. Спб. ОтдѢла О-ва Взаимопомощи Полочанъ». На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны толькі для адраса. На правым баку, унізе, змешчаны надпіс, які зроблены ў 1 радок чарнілам сіняга колеру: «Во внутреннем парке». На адваротным баку ў два радкі сінім чарнілам: «Урок гимнастики во внутреннем парке. Снимок до 1901 года». Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Вержбаловіча Б.Г.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўклаць, пацёртасць плямы, на адваротным баку сляды ад клею, надпісы. (Ф)

**78. «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусѢ.»**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

9,2 х 13,9 см

ПИАЗ КП9- 5593/10

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява цэнтральнай часткі г. Полацка, від з вежы Мікалаеўскага сабора. Пад здымкам - белая гарызантальная паласа (1,8 см), на якой тыпаграфскім шрыфтам чорнага колеру, у 2 радкі, змешчаны надпісы: «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусѢ», ніжэй, злева: «По фотогр. Полк. Никушкина», справа: «Изд. Спб. ОтдѢла О-ва Взаимопомощи Полочанъ». На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны толькі для адраса. На правым баку, унізе, у 1 радок: «С колокольни Собора». На адваротным баку сінім чарнілам ў 3 радкі: «Общий вид города и р.Зап. Двина //с колокольни Собора

(б. костела) //в 1901 - 1909 гг.» Ніжэй, у 1 радок, простым алоўкам: «Вид на восточную сторону города, 1903 г.» Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Вержбаловіча Б.Г.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўклаць, пацёртасць, плямы, надпісы. (Ф)

**79. «Изъ воспоминаній о Полоцкомъ кадетскомъ корпусѢ.»**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

9,0 х 14,0 см

ПИАЗ КП9 - 5593/11

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчаны выявы: а) злева надрукавана выява паўкруглай таблічкі залатыстага колеру з надпісам: «7 октября 1812 года», якая абрамляе ўверсе круглую чыгунную бомбу; б) ніжэй - выява перакрыжаваных пагон кадэтаў Полацкага кадэцкага корпуса (алага колеру з белым кантам, літарамі «П.К.» і жоўтым гузікам ўверсе. Пад пагонамі дамалявана стылізаваная стужка жоўтага колеру з надпісам стрыжням чорнага колеру: «1909 г.». Пагоны і надмаляваная стужка абведзены чорным стрыжням, пачыная ад паўкруглай таблічцы, у форме неправільнага шэсцівугольніка - форма жэтона. Крыху правей - дамалёваны на- грудны знак у памяць 75-годдзя ПКК (крыжападобнай формы, асноўны колер - чырвоны, уверсе вертыкальнай перакладзены - сталізаваная выява шапкі Манамаха (жоўтага колеру); в) у цэнтры - двуглавы арол, які абхватвае Дзяржаву з вензелем Микалая Другога (літара «Н»), ніжэй - выява чыгуннай бомбы і паўкруглай таблічкі з надпісам «7 октября 1812 г.». У ніжнім правым вуглу паштоўкі змешчаны надпіс: «Изд. Спб. ОтдЪла О-ва Взаимопомощи Полочанъ». На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны толькі для адраса. На правым баку паштоўкі, пад выявай жэтона - надпіс, які зроблены сінім чарнілам: «Жетон Полоцк. Кад. Корп. Носился на правой верхней пуговице двубортного мундира» у 4 радкі). Пад выявай нагруднага знака - надпіс стрыжням, які зроблены пазней: «Нагрудный знак в память 75ти- летия Полоцкого Кадетского корпуса 1835 - 1910 г. носился на левой стороне груди» (у 4 радкі). На адваротным баку - надпіс сінім чарнілам у 7 радкоў: «жетон Полоцкого кадетского корпуса: Русская неразорвавшаяся бомба в стене корпуса, попавшая туда 7 октября 1812 г. - когда русские войска под командованием ген. Витгенштейна взяли Полоцк,

занятый французами. Погоны кадет алого цвета с черным кантом ранее, а затем с белым кантом.» Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Вержбало- віча Б.Г.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, загі- бы вуглоў, надпісы, на адвароце - сляды ад клею, пашкоджанне верхняга слоя кардону. (Ф)

**80. «Изъ воспоминанiй о Полоцкомъ кадетскомъ корпусЪ.»**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

14,1 х 9,0 см

ПИАЗ КП9 - 5593/12

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па вертыкалі. На правым баку змешчаны выявы трох фотаздымкаў Р.І. Кандраценка, выха- ванца Полацкага кадэцкага корпуса, палачаніна, абаронцы Порт-Артура. На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для адраса і пісьма. На правым баку паштоўкі змешчаны надпіс. які зроблены чарнілам сіняга колеру: «Герой и / / гордость / / Порт - Артура // убит 2 декабря 1904 г. на // форту №2». На адваротным баку - надпіс чарнілам сіняга колеру: «Душа и гордость» / / Порт Артура // (Убит 2 декабря 1904 г. (15 н. Стиль старый) на форту №2/ / После чего очень быстро / / крепость Порт Артур / / была сдана его комен- / / дантом ген. Стесселем / / японцам 2 января 1905 // (ст. стиля).» Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Вержбаловіча Б.Г.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, плямы, надпісы. (Ф)

## РАЗДЕЛ 3

### *3.1 Выдавец Фрыц Краускопф, г. Кенігсберг.*

3.1.1

**81. «Blick auf Polozk» (?) («Погляд на Полацк»)**

Кардон тонкі; фотатыпія. рукапіс.

9,0 х 13,8 см

ПИАЗ КП5 - 2321/9

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. Ні правым баку змешчана выява драўлянага моста праз раку Зах. Дзвіну, на

якім размешчана вартавая будка і каравульны. На левым беразе ракі - драўляныя матэрыялы, лодкі. На правым беразе ракі - панарама горада з выявай Мікалаеўскага Сабора. На адваротным баку - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для пісьма адраса і маркі. На адвароце змешчаны паўсцёрты неразборлівы надпіс. Справа - штамп.

Захаванасць : агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны вуглоў, пацёртасць, на правым баку, ўверсе, тыпаграфскі надпіс зацёрт белай фарбай. (Ф).

**82. «Blick auf Polozk» («Погляд на Полацк»).**

Кардон тонкі; фотатыпія. рукапіс.

8,9 x 13,9 см

ПИКЗ КП9 - 5592/2

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява драўлянага моста праз раку Зах. Дзвіну, на якім размешчана вартавая будка і каравульны. На левым беразе ракі - драўляныя матэрыялы, лодкі. На правым беразе ракі - панарама горада з выявай Мікалаеўскага Сабора. Уверсе паштоўкі, па цэнтры, змешчаны надпіс: «Blick auf Polozk», які зроблены чорным шрыфтам у 1 радок. На адваротным баку - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для пісьма адраса і маркі. На адвароце змешчаны надпіс, які зроблены чарнілам сіняга колеру: « Koch...nu, srocfony // Andrio Za...embcka / / Zosia Karvecko / / ...adav Zinedvier // Zodov Ziniehvier / / Wicia Kawecka» .

Захаванасць : агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны вуглоў, драпіны, пацёртасць, надпіс. (ПКМ)

**83. «Polock» (?)**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

9,0 x 13,8 см

ПИАЗ КП5 - 2331/14

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява панарамы г. Полацка з боку р. Зах. Дзвіны. На адваротным баку - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для пісьма, адраса і маркі. На адвароце змешчаны надпіс на польскай мове : 13 радкоў неразборлівым почыркам.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны

вуглоў, драпіны, пацёртасць, надпіс, на правым баку ўверсе, у цэнтры, белай фарбай зацёрта назва паштоўкі, па ўсей верагоднасці, слова: «Polock». (Ф)

**84. «Polozk».**

Кардон тонкі; фотатыпія.

8,9 х 13,9 см

ПИАЗ КП9 - 5592/1

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява вул.Ніжнепакроўскай з боку Сафійскага Сабора. Воддаль - выявы лютэранскай кірхі і Богаяўленскага манастыра. Справа - выява р. Зах. Дзвіны і панарама Задзвіння. Уверсе, па цэнтры, змешчаны надпіс: «Polozk» («Полацк»), які зроблены шрыфтам чорнага колеру. На адваротным баку - паштовыя адзнакі.

Захаванасць : агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны вуглоў, пацёртасць, надпіс, надрыў верхняга левага вугла - 1,7 см, страта левага ніжняга вугла. (Ф)

**85. «Gruß aus Polozk» . («Прывітанне з Полацку»)**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

9,0 х 13,8 см

ПИАЗ КП5 - 2298

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява Віцебскай вуліцы г.Полацка пачатку ХХ стаг. У цэнтры кампазіцыі - выява будынка Полацкага кадэцкага корпуса і Помніка героям вайны 1812 года. На першым плане, злева, выява двух мужчын у вайсковай форме, якія ідуць па тратуары вуліцы. Уверсе справа, змешчаны надпіс: «Gruß aus Polozk». («Прывітанне з Полацку»). На адваротным баку - паштовыя адзнакі. На адвароце, бліжэй да цэнтру, змешчаны надпіс, які зроблены чарнілам фіялетавага колеру: «№2». Справа ад цэнтра - штамп полацкага краязнаўчага музея 1950-х гадоў.

Захаванасць : агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны вуглоў, пацёртасць, надпіс. (МБК)

**86. «Gruß aus Polozk» . («Прывітанне з Полацку»)**

Кардон тонкі; фотатыпія.

9,0 х 13,8 см

ПИАЗ КП9 - 5592/4

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява Віцебскай вуліцы г.Полацка пачатку ХХ стаг. У цэнтры кампазіцыі - выява будынка Полацкага кадэцкага корпуса і

Помніка героям вайны 1812 года. На першым плане, злева, выява двух мужчын у вайсковай форме, якія ідуць па тратуары вуліцы. Уверсе справа, змешчаны надпіс: «Gruß aus Polozk». («Прывітанне з Полацку»). На адваротным баку - паштовыя адзнакі.

Захаванасць : агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны вуглоў, пацёртасць. (ПКМ)

**87. «Gruß aus Polozk». («Прывітанне з Полацку»)**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

9,0 х 13,9 см

ПИАЗ КП5 - 2303

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчаны выявы р. Зах. Дзвіны, якая скавана ільдом, і драўляных будынкаў г. Полацка, якія размешчаны ўздоўж берага ракі. На першым плане - людзі ў сялянскай вопратцы, ў санях, едуць па скаванай ільдом рацэ. Уздоўж берага - лодкі, воддаль - драўляны мост праз раку. Уверсе, бліжэй да правага вугла паштоўкі змешчаны надпіс: «Gruß aus Polozk». («Прывітанне з Полацку»), які закітаваны белай фарбай. На адваротным баку - паштовыя адзнакі. На адвароце, уздоўж выхадных звестак, змешчаны надпіс чарнілам чорнага колеру: «Поездка из г.Полоцка (тема сельской жизни)». Справа ад цэнтра - штамп полацкага краязнаўчага музея 1950-х гадоў.

Захаванасць : агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны вуглоў, пацёртасць, надпіс, штамп. (МБК)

**88. «Gruß aus Polozk». («Прывітанне з Полацку»)**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

8,9 х 13,9 см

ПИАЗ КП9 - 5592/5

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчаны выявы р. Зах. Дзвіны, якая скавана ільдом, і драўля- ных будынкаў г. Полацка, якія размешчаны уздоўж берага ракі. На першым плане - людзі ў сялянскай вопратцы, ў санях, едуць па скаванай ільдом рацэ. Уздоўж берага - лодкі, воддаль - драўляны мост праз раку. Уверсе, бліжэй да правага вугла паштоўкі змешчаны надпіс: «Gruß aus Polozk» («Прывітанне з Полацку»), які закітаваны белай фарбай. На адваротным баку - паштовыя адзнакі.

Захаванасць : агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны вуглоў, пацёртасць, страта верхняга правага вугла, надрыў са стратай фрагмента ўнізе паштоўкі, два вертыкальныя заломы. (Ф)

**89. «Gruß aus Polozk». («Прывітанне з Полацку»)**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

8,9 x 13,7 см

ПИАЗ КП5 - 2321/ 1

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява галоўнай (парадняй) плошчы г.Полацка з Помнікам героям вайны 1812 года на першым плане. Здымак зроблены са званіцы Мікалаеўскага Сабора. Уверсе, над зымкам, чорным тыпаграфскім шрыфтам у 1 радок змешчаны надпіс: «Gruß aus Polozk» («Прывітанне з Полацку»), На адваротным баку - паштовыя адзнакі.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны вуглоў, пацёртасць, на адвароце - плямы ад клею. (Ф)

**90. «Polozk. Markf». («Полацк. Рынак»)**

Кардон тонкі; фотатыпія.

8,8 x 13,8 см

ПКМ КП1 - 261

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява полацкага рынка. На першым плане - сялянкі, якія гандлююць бульбай; воддаль - будынкі склада, фурманкі. У верхнім левым вуглу змешчаны надпіс: «Polozk. Markf», які зроблены шрыфтам чорнага колеру ў 1 радок. На адваротным баку - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для пісьма, адраса і маркі.

Захаванасць : агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны вуглоў, пацёртасць, вертыкальны надрыў уверсе паштоўкі - 1,7 см. (ПКМ).

**91. «Polozk. Markf» («Полацк. Рынак») (?)**

Кардон тонкі; фотатыпія, рукапіс.

9,0 x 14,0 см

ПИАЗ КП5 - 2513/5

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява полацкага рынка. На першым плане - сялянкі, якія гандлююць бульбай; воддаль - будынкі склада, фурманкі. На адваротным баку - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для пісьма, адраса і маркі. На адвароце змешчаны надпісы, які зроблены

чарнілам чорнага і фіялетавага колераў: уверсе па дыяганалі - «(Въ память// новой власти)», справа: «1918 г. 22 ноября // Полоцкъ // женск. гим.»

Захаванасць : агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны вуглоў, пацёртасць, страта верхняга левага вугла. (Ф)

**92. «Polozk. Markf». («Полацк. Рынак») (?)**

Кардон тонкі; фотатыпія.

9,0 x 14,0 см

ПГКМЗ КП15 - 13521

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява полацкага рынка. На першым плане - сялянкі, якія гандлююць бульбай; воддаль - будынкі склада, фурманкі. У верхнім левым вуглу змешчаны надпіс: «Polozk. Markf», які зроблены ў 1 радок шрыфтам чорнага колеру. На адваротным баку - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для пісьма, адраса і маркі.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны вуглоў. (Ф)

**93. «ФЛ №2 Полацкаго кадкорпуса».**

Кардон тонкі; фотатыпія.

8,2 x 13,7 см

ПИАЗ КП5 - 2513/6

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява двухпавярховага будынка з шыльдай «ФЛ №2 Полацкаго кадкорпуса». Каля ўвахода - два вайскоўца і дзве жанчыны-медсёстры. На першым плане, ў ніжнім правым вуглу, група вайскоўцаў. Каля левага края будынка - слуп з надпісам: «На военный мостъ». Назва паштоўкі абрэзана (зверху). На адваротным баку - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для пісьма, адраса і маркі.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, загіны вуглоў. (ПКМ)

**94. «Kirche in Polozk». («Кірха у Полацку»)**

Кардон тонкі; фотатыпія.

13,8 x 9,0 см

ПИАЗ КП9 - 5592/3

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па вертыкалі. На правым баку змешчана выява будынка люцеранскай кірхі. Перад фасадам невялікія дрэвы без лісцця. Каля цэнтральнага ўвахода мноства

людзей - салдаты, афіцэры, жанчыны. Уверсе паштоўкі, па цэнтры, змешчаны надпіс: «Kirche in Polozk» («Кірха ў Полацку»), які зроблены чорным шрыфтам у 1 радок. На адваротным баку - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для пісьма, адраса і маркі.

Захаванасць : агульнае забруджванне, пажоўкласць, загіны вуглоў, плямы. (ПКМ)

**3.2 Выдавец Георг Штильке, г. Берлин. Фотаздымкі Зергеля Шольца.**

**95. «Polozk».**

Кардон тонкі; фотатыпія.

8,7 x 13,6 см

ПИАЗ КП5- 2513/2

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява р. Зах. Дзвіны. На першым плане - схіл берага, на якім пабудаваны прычал з лодак, да якога прышвартованы невялікі параходзік з мноствам пасажыраў на палубе. На другім беразе ракі - панарама г. Полацка з выявай драўляных аднапавярховых будынкаў. Уверсе, злева, змешчаны надпіс: «Polozk» («Полацк»). На адваротным баку - паштовыя адзнакі, выхадныя звесткі, якія размешчаны ўздоўж вертыкальнага левага зрэзу паштоўкі ў два радкі шрыфтам чорнага колеру. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для пісьма, адраса і маркі.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, загіны вуглоў, плямы. (ПКМ)

**96. «Polozk».**

Кардон тонкі; фотатыпія.

8,5 x 13,8 см

ПИАЗ КП6-2827/10

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява панарамы г.Полацка з боку р. Зах. Дзвіны. У цэнтры кампазіцыі - выява будынкаў Кадэцкага корпуса, Богаяўленскай і Мікалаеўскай царквы. На першым плане - выява ракі, ўздоўж правага берага - невялікія драўляныя дамы. Уверсе, справа, змешчаны надпіс: «Polozk». На адваротным баку - паштовыя адзнакі, выхадныя звесткі, якія размешчаны ўздоўж вертыкальнага левага зрэзу паштоўкі ў два радкі шрыфтам чорнага колеру.

Адваротны бок паштоўкі прызначаны для пісьма, адраса і маркі. Паштоўка з калекцыі матэрыялаў Гатоўскага К.Ф.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, загіны вуглоў, плямы. (МБК)

**97. «Polozk».**

Кардон тонкі; фотатыпія.

8,5 х 13,8 см

ПИАЗ КП5-2513/1

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява панарамы г. Полацка з боку р. Зах. Дзвіны. У цэнтры кампазіцыі - выява будынкаў Кадэцкага корпуса, Богаяўленскай і Мікалаеўскай царквы. На першым плане - выява ракі, ўздоўж правага берага невялікія драўляныя дамы. Уверсе, справа, змешчаны надпіс «Polozk». На адваротным баку - паштовыя адзнакі, выхадныя звесткі, якія размешчаны ўздоўж вертыкальнага левага зрэзу паштоўкі ў два радкі шрыфтам чорнага колеру.

Адваротны бок паштоўкі прызначаны для пісьма, адраса і маркі.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, загіны вуглоў, плямы. (МБК)

## РАЗДЕЛ 4

**98. «Полоцкъ».**

Кардон тонкі; фотатыпія.

9,1 х 13,7 см

ПИАЗ КП5-2472/1

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява панарамы г. Полацка з боку р. Зах. Дзвіны. У цэнтры кампазіцыі - будынкі кадэцкага корпуса, Мікалаеўскі Сабор, Богаяўленскі Сабор. Воддаль - Сафійскі Сабор. На першым плане выява ракі Зах. Дзвіны і лодкі з веслярамі. У ніжнім левым вуглу змешчаны надпіс: «Полоцкъ», які зроблены шрыфтам чорнага колеру. На адваротным баку - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для адраса.

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, загіны вуглоў, плямы, у цэнтры паштоўкі маленькая дзірка (0,4 см).

**99. «Полоцкъ».**

Кардон тонкі; фотатыпія.

8,7 x 13,8 см ПИАЗ КП9 - 5593/1

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява панарамы г. Полацка з боку р. Зах. Дзвіны. У цэнтры кампазіцыі - будынкі кадэцкага корпуса, Мікалаеўскі Сабор, Богаяўленскі Сабор. Воддаль - Сафійскі Сабор. На першым плане выява ракі Зах. Дзвіны і лодкі з веслярамі. У ніжнім левым вуглу змешчаны надпіс: «Полоцкъ», які зроблены шрыфтам чорнага колеру. На адваротным баку - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны толькі для адраса. На правым баку паштоўкі, унізе, на белай паласе, змешчаны надпісы, які зроблены чарнілам сіняга і фіялетавага колерамі - злева: « на р. Западная Двина», справа: « У Двины и Полоты стоит / / Город Полоцк.// Посети его и ты// Станешь сразу молод!». На адваротным баку паштоўкі змешчаны надпіс, які зроблены чарнілам сіняга колеру: «Полоцк был взят поляками в 1582 году при / / Стефане Батории// Один из древнейших городов России // Известен с 862 года, как Полотеск //в центре бывшая Иезуитская коллегия / / построенная при польском короле Стефане Батории. / / (духовная академия католическая) С 1835 г. // по 1914 г. Полоцкий кадетский корпус. В 1919 г. / / эвакуирован : в Москву 2 рота, в суммы - 3-я рота / / и во Владикавказ - 1 рота со знаменем. / / Слева на снимке Собор Св. Софии построен в // 1044 - 66 гг. Восстановлен в 18 веке // В 1901-1909 гг. стоял почти в развалинах// но колокольни были целые.»

Захаванасць : агульнае забруджванне, пажоўкласць, загіны вуглоў, плямы, надпісы. (Ф)

**100. «Polozk».**

Кардон тонкі; фотатыпія.

8,7 x 13,8 см

ПИАЗ КП5 - 2536/10

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява г. Полацка з боку р. Зах.Дзвіны. Летні фотаздымак. У цэнтры кампазіцыі будынкі кадэцкага корпуса, Мікалаеўскі Сабор. Воддаль - Сафійскі Сабор. У ніжнім левым вуглу змешчаны надпіс: «Polozk». На адваротным баку - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для адраса і пісьма. На адваротным баку зме-

шчаны два авальныя штампы (ледзь разборліва) - 5,0 х 4,2 см, фрагмент надпіса: « ... Полесск. ж. д. Литва ...»

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, загіны вуглоў, пацёртасць, штампы. (Ф)

**101. Выява фасада будынка Полацкага кадэцкага корпуса.**

Кардон тонкі; фататыпія, рукапіс.

9,8 х 15,3 см (10,7 х 16,6 см)

ПИАЗ КП5- 2321/12

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па гарызанталі. На правым баку змешчана выява фасада будынка Полацкага кадэцкага корпуса, галоўнага ўвахода. Паштоўка наклеяна на паспарту. На адваротным баку, на паспарту, змешчаны надпіс, які зроблены чарнілам чорнага колеру: «Видъ зданія Полоцкаго кадетскаго корпуса (фасадъ)».

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, пацёртасць, плямы, надпіс. (Ф)

**102. «Мітынг піянераў у г. Полацку 2 мая 1924 г.»**

Фотапапера матавая, адбітак чорна-белы, рукапіс.

13,7 х 8,7 см.

ПИАЗ КП5-2432

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па вертыкалі. На правым баку змешчана выява цэнтральнай плошчы г. Полацка 20-х гадоў XX стаг. У цэнтры кампазіцыі - Мікалаеўскі Сабор, вакол яго - будынкі кадэцкага корпуса. Плошча запоўнена людзьмі. На адвароце - паштовыя адзнакі. На адваротным баку змешчаны надпіс, які зроблены чарнілам фіялетавага колеру:«2 мая 1924 года //Митинг пионеров //в г.Полоцке. / / Когда же меня избрали почетным / / пионером, целый день пришлось / / носить красный галстук, который // храню. // М. Маркевичюс.»

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, заломы вуглоў, драпіны, плямы, надпіс. (МБК)

**103. Выява манастырскага млына.**

Фотапапера матавая, адбітак чорна-белы, рукапіс.

8,8 х 13,9 см. ПИАЗ КП5-2513/7

Паштоўка, прамавугольнай формы, выцягнута па вертыкалі. На правым баку змешчана выява будынкаў Спасскага манастыра і манастырскага млына. Фотаздымак паштоўкі, памерамі 8,3 х 11,3, зрушаны ўправа,

злева - белая паласа (8,8 х 2,3 см). У ніжнім правым вуглу змешчаны надпіс, які зроблены рукапісным шрыфтам у 4-ы радкі: «Aloster // Monastir ь/Polozk //den 11-4-18// Uufn №15 Russland». На адвароце - паштовыя адзнакі. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для адраса і пісьма. На адваротным баку змешчаны надпіс, які зроблены чарнілам чорнага колеру: «Пишу читаю / / На память //о пріятно / / проведенныхъ // минутахъ // ... на // лонЪ природы // 1918 // 1918 г. 9 ноября // суббота. Спасская мельница / / Полоцкъ.»

Захаванасць: агульнае забруджванне, пажоўкласць, заломы вуглоў, надпіс.(Ф)

## ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК

БЕРНАРДО ЛЯОН (XIX ст.) - французскі кнігагандляр, выдавец першых ілюстраваных паштовак.

ВЕРЖБАЛОВІЧ БАРЫС РЫГОРАВІЧ (1891 - ? гг.) - выхаванец кадэцкага корпуса г. Полацка .

ГАТОЎСКІ КАРП ХВЁДАРАВІЧ (1892 - 1947 гг.) - першы уездны вайсковы камісар г. Полацка.

ГОФЕНШЭФЕР Ш. - грамадзянін г.Полацка, уладальнік кнігарні, выдавец паштовак з краявідамі Полацка, пачатак XX стаг.

КРАУСКОПФ ФРЫЦ (сяр. XIX - пач. XX ст.) - немец, выдавец паштовак з краявідамі Полацка; выдавецтва знаходзілася ў г.Кёнігсберг.

ЛІЎШЫЦ М.М. (сяр. XIX - пач. XX ст.) - грамадзянін г.Полацка, уладальнік магазіна пісьмовых тавараў, выдавец паштовак з краявідамі Полацка.

РАФАЙЛОВІЧ Л.А. (сяр. XIX - пач. XX ст.) - грамадзянін г.Полацка, уладальнік магазіна пісьмовых тавараў, выдавец паштовак з краявідамі Полацка.

СУВОРЫН АЛЕКСЕЙ СЯРГЕЕВІЧ (1834 - 1912 гг.) - рускі журналіст, уладальнік выдавецкай кампаніі «Изд. Контрагентства А.С.Суворина и К». Меў манапольнае права кніжна-газетнага гандлю на чыгуначных станцыях Расійскай Імперыі.

ЦВЯТКОЎ Х.Т. (кан. XIX - пач. XX ст.) - маскоўскі выдавец паштовак з краявідамі г. Полацка.

ШТЫЛЬКЕ ГЕОРГ (кан. XIX - пач. XX стаг.) - немец, уладальнік друкарнага выдавецтва ў г.Берліне, займаўся выпускам паштовак з відарысам г.Полацка ў пач. XX ст.

ШОЛЬЦ З. (кан. XIX - пач. XX ст.) - немец, фатограф, які ў пачатку XX ст. фатаграфаваў архітэктуру г.Полацка.

ШВАРЦ А. (кан. XIX - пач. XX ст.) - кнігагандляр, адзін з першых выдаўцоў першых ілюстраваных паштовак.

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

ВІНЬЕТКА - упрыгожанне ў выглядзе арнаменту або малюнка ў пачатку кнігі, раздзела або ў канцы іх.

ІНТЭР'ЕР - унутранная частка памяшкання, архітэктурна і па-мастацку аформленая.

ЛІТАГРАФІЯ - друкаванне з плоскай паверхні каменя, на якім зроблены малюнак. Адбітак, малюнак, атрыманы такім спосабам. Цэх, прадпрыемства, дзе друкуюць такім спосабам.

МАРКА - знак аплаты паштовых або гербавых збораў - звычайна ў выглядзе чатырохвугольнай наклейкі з выявамі і абазначэннем цэны.

ПАШТОЎКА - спецыяльная паштовая картка для адкрытага пісьма, адкрытка.

РЭПРАДУКЦЫЯ - узнаўленне малюнка, карціны, друкаванага тэкста сродкамі паліграфіі або фотаграфіі; узнаўленне пры дапамозе друку выявы - малюнак, карціна, фотаздымак.

СЕРЫЯ - шэраг аднародных прадметаў, якія маюць агульную прымету. Паслядоўны рад чаго-н.

ФАСАД - пярэдняя галоўная частка будынка, якая выходзіць на вуліцу.

ФІЛАКАРТЫЯ - збор мастацкіх паштовак.

ФОТАТЫПІЯ - спосаб плоскага друку са шкляной або металічнай зярністай пласціны, якая пакрыта светаадчувальным хромажэлацінавым слоем, на якую фатаграфічным спосабам наносіцца узнаўленая выява; пры друкаванні фарбай змачваецца толькі друкарныя элементы.

ШРЫФТ - камплект друкарскіх літар, знакаў прыпынку, лічбаў. Тып гэтых літар.

## ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА АБ АРХІТЭКТУРНЫХ ПОМНІКАХ, ЯКІЯ АДЛЮСТРАВАНЫ НА ПАШТОЎКАХ

**Богаяўленскі мужчынскі манастыр**

У 16-18 стст. складаўся з драўлянай царквы і будынка брацкай школы. Упамінаецца ў 1633-1636 гг., калі князь Леў Самуіл Агінскі і міравы земскі суддзя Севасцьян Мірскі аднавілі прыстанак пасля пажару і пасадзейнічалі заснаванню праваслаўнага брацтва; манастыр як праваслаўны зацверджаны граматай Уладзіслава IV у 1633 г. Пасля пажару 1757 г. у 1761-1779гг. пабудаваны мураваны Свята-Богаяўленскі сабор. У пачатку XIX ст. з усходу ад царквы пабудаваны «эканамічны дом» (не захаваўся). На пачатак 20 ст. пры манастыры налічвалася 28 чалавек браціі пад кіраўніцтвам архімандрыта Яўфімія. /9, 23 /

***Богаўленскі сабор*** - помнік архітэктуры барока, другая палова XVIII ст., часткова адноўлены ў XIX ст. Пасля рэстаўрацыі, у 1981 г. у саборы размясцяла- ся карцінная галерэя. З 1991 г. - дзеючы храм./9, 23 /

***Жылы корпус*** - помнік архітэктуры барона і класіцызму. Пабудаваны на месцы драўлянай брацкай школы. Г-падобны ў плане мураваны будынак, у якім знаходзіліся келлі манахаў і пакоі ігумена (ва ўсходнім крыле), дзве «цёплыя» царквы - Свята-Ефрасіннеўская и Свята-Кацярынінская. У 1784-1791 і 1812- 1819 гг. у корпусе размяшчалася народнае вучылішча, у 1792-1812гг. - багадзельня. У 1970-я гг. рэстаўрыраваны. Выкарыстоўваўся як жылы дом. Цяпер у будынку: Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага і Музей беларускага кнігадрукавання. У 1959 г. на будынку ўстаноўлена мемарыяльная дошка Сімяону Полацкаму./9/

**Касцёл Святога Стафана і езуіцкі калегіум**

Езуіцкі калегіум заснаваны ў 1581 г. П. Скаргай як сярэдняя навучальная ўстанова класічнага (пераважна філалагічнага) тыпу.

Драўляныя будынкі, пастаўленыя ў 1581 г. на востраве Заходняй Дзвіны, у якіх размясціўся калегіум, у пачатку 17 ст. згарэлі. У 1-й палове 17 ст. на новым месце паміж Верхнім замкам і горадам пабудаваны драўляны касцел св.Стафана, будынкі келляў і вучылішчаў. У 1733-45 гг. пасля пажару на месцы драўлянага ўзведзены мураваны касцёл - трохнефавая крыжова-купальная базіліка з двухвежавым фасадам. Перад касцёлам сфарміравана вялікая прамавугольная Парадная пл. - галоўная ў горадзе. У 1750 г. побач з касцёлам пачалі ўзводзіць мураваны 3-павярховы галоўны будынак калегіума, які злучаўся з касцёлам. Е-падобны ў плане пад чарапічным дахам будынак галоўным падоўжным фасадам быў арыентаваны на поўдзень, на Заходнюю Дзвіну, был злучаны з касцёлам. У двухпавярховым сярэднім крыле на 1-м паверсе размяшчалася трапезная, на 2-м - бібліятэка і музей, да трапезнай прылягаў аднапавярховы будынак кухні. Астатняя частка будынка мела калідорную сістэму планіроўкі, капітальнымі сценамі была падзелена на 105 памяшканняў. Перакрыцці на ўсіх паверхах - цыліндрычныя скляпенні. Будынак абаграваўся «цёплай» (з хадамі для цяпла) падлогай. У сценах зроблены вентыляцыйныя хады, у падвалах - развітая сістэма падземных вадасцёкаў. Зберагліся паўднёвая частка корпуса і заходняе крыло. У 1778 г. паралельна будынку касцёла ўзведзены трохпавярховы корпус, у якім на 1-м паверсе размясціліся кнігарня, на 2-м - спачатку вучылішча, потым друкарня, на 3-м - тэатр. З паўночнага боку да касцёла прыбудаваны двухпавярховы Г-падобны ў плане флігель для ксяндзоў, які аб'яднаў касцёл і галоўны корпус. У 1780 г. пабудаваны адна - і двухпавярховыя карпусы гаспадарчых службаў (бровар, медаварня, піваварня, пякарня, кузня, майстэрні і інш.; не зберагліся), якія абмяжоўвалі тэрыторыю калегіума з поўначы і захаду і замыкаліся двухпавярховым будынкам з брамай. Побач размяшчалася аптэка з лабараторыяй і сушыльняй для траў. У 1785 г. пасля прыезду ў Полацк (у якасці генерала ордэна) архітэктара і матэматыка Габрыэла Грубэра пабудаваны корпус (злучыў трохпа-

вярховы і галоўны карпусы), дзе размясціліся карцінная галерэя, музей, абсерваторыя, хімічная лабараторыя, вучэбныя кабінеты (не зберагліся). На поўдзень ад аптэкі пабудаваны 2 флігелі - памяшканні для семінарыстаў і багадзельні. Паўднёвы схіл узгорка, на якім стаяў галоўны корпус, быў умацаваны падпорнай сцяной (збераглася), на створанай тэрасе разбіты пладовы сад. У 1812 г. калегіум пераўтвораны ў езуіцкую акадэмію - вышэйшую каталіцкую навучальную ўстанову. У 1820 г. акадэмія закрыта. З 1822 г. калегіум займалі манахі ордэна піяраў. У 1830 г. ў Полацку заснаваны кадэцкі корпус, які размясціўся ў будынках калегіума. Да 1835 г. былі рэканструяваны старыя і пабудаваны новыя карпусы: кадэцкі корпус (прыбудаваны да заходняга крыла галоўнага корпуса былога калегіума), дом дырэктара і 5 службовых будынкаў (арх. А. Порта; збе- рагліся часткова). Каля 1838 г. касёл перабудаваны ў Мікалаеўскую царкву (не збераглася). /3, 24/

**Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр**

Заснаваны ў сярэдзіне 12 ст. полацкай князеўнай Ефрасінняй Полацкай як абарончы фарпост Полацка (з поўначы). Неаднаразова быў разбураны і перабудаваны, апошні раз - у 2-й палавіне 19 - пачатку 20 ст. У ансамбль уваходзілі 2 мураваныя царквы 12 ст.(збераглася Спаса-Праабражэнская), мураваная ўязная брама 16 ст. (збераглася цэнтральная частка), жылы манастырскі корпус пачатку 18 ст. (збярогся), шэраг службовых і гаспадарчых памяшканняў, сад, агарод. /5/

У 1579 г. польскі кароль Стафан Баторый заснаваў у манастыры свою рэзідэнцыю. У 1580 г. Стэфан Баторый аддаў яго з прыналежнымі вёскамі Полацкаму езуіцкаму калегіуму. У 1656 г. паводле загаду расійскага цара Алексея Міхайловіча Спаса-Праабражэнская царква паўторна асвячона як праваслаўная, у 1667-1820 гг. зноў належіла езуітам, якія ператварылі яе ў касцёл. У 1830 г. паезуіцкія маенткі былі ўзяты ў казну, а царква ў 1832 г. перададзена праваслаў- наму духавенству. Сюды з Полацкага Сафійскага сабора быў вернуты і крыж Ефрасінні Полацкай. / 25 /

З 1841 г. манастыр зноў дзейнічае як жаночы. Манастыр значна пацярпеў у час вайны 1812 г. ад гарматнага абстрэлу. У 1910 г. з Кіева былі урачыста перавезены мошчы Св. Ефрасінні Полацкай. У пачатку 1918 года манастыр закрыты. У Вялікую Айчынную вайну знішчаны ўсе драўляныя будынкі. Сваю дзейнасць манастыр аднавіў у 1990 г./11 /

***Спаса-Праабражэнская царква.*** Пабудавана паміж 1152г. І 1161 г. полацкім дойлідам Іаанам па заказу Ефрасінні Полацкай як саборны храм Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. У 19 ст. часткова перабудавана (арх. А. Порта). Царква - мураваны прамавугольны выцягнуты ў плане (8х12м) аб'ём з купалам на высокім барабане. У заходняй сцяне (у 2 разы таўсцейшая за паўднёвую і

паўночную) лесвічны ход на хоры (асаблівасць полацкай школы дойлідства). Па баках хораў 2 маленькія келлі, адна з якіх паводле падання, прызначалася для Ефрасінні Полацкай. У царкве пад больш познімі напластаваннямі тынкоўкі і пабелкі, алейнай размалёўкі 1832-35 гг. і 1840 г. захаваліся унікальныя старажытнарускія фрэскі, створаныя майстрамі полацкай школы ў 2-й палове 12 ст. /5, 22 /

***Крыжаўзвіжанскі сабор.*** У цэнтры манастырскага комплексу, злева перад Спаса-Ефрасіннеўскай царквой. Пабудаваны ў 1893-1897 гг. паводле праекта віцебскага губернскага архітэктара У.Ф.Коршыкава. Закладка храма здейснена 23.05.1893 г. праасвяшчэнным Антанінам. Помнік манументальнай архітэктуры руска-візантыйскага накірунку рэтраспектыўна-рускага стылю./5/

У 1992 г. адбудаваны занава. З 1997 г. тут захоўваецца занава створаны крыж Ефрасінні Полацкай. / 25 /

***Уязная брама са званіцай.*** Пабудавана ў 1882 г. з цэглы. Да брамы далучаны 2-павярховы мураваны жылы корпус пад вальмавым дахам - помнік архітэктуры пачатку 20 ст. /11/

**Сафійскі сабор**

Пабудаваны ў XI ст.(на працягу пяці будаўнічых сезонаў) пры полацкім князі Усяславе Брачыславічу як цытадэль у дзядзінцы горада - Верхнім замку. Спачатку крыжова-купальны квадратны ў плане храм, даўжыня сцен 24-26 м, меў 7 купалоў (паводле некаторых звестак 5), вялікую трохчастковую апсіду з усходняга боку. Сцены складзены з прыроднага каменю і плінфы ў тэкніцы паласатай муроўкі (кладка са «схаваным радам»), што стварала двухколерную гаму паверхні, характэрнай для полацкай школы дойлідства./4/

Сабор гарэў у 1607г., у 1620 г. адбудаваны полацкім архіепіскапам Іасафатам Кунцэвічам. У 1643 г. ў Полацку адбыўся вялікі пажар, гарэла і Сафія, але яе зноў адбудавалі. Першапачатковы сабор 11 ст. - помнік манументальнага старажытна-рускага дойлідства. У канцы 15 ст. - пачатку 16 ст. перабудаваны ў 5-вежавы храм абарончага тыпу. Значна перабудаваны ў 1620 г. пры архіепіскапе Іасафаце Кунцэвічу. Паводле заказу полацкага архіепіскапа Фларыяна Грабніцкага ў 1738-1750 гг. перабудаваны архітэктарам І. К. Глаўбіцам і каменшчыкам Б. Касінскім у стылі віленскага барока. Пераарыентаваны з поўдня на поўнач, галоўным фасадам арыентаваны на Заходнюю Дзвіну, а магутнай і высокай апсідай - на горад. Рэстаўрыраваны ў 1913 г. пры удзеле расійскага архітэктара П. П. Пакрышкіна. У 1918 г. ў саборы быў нямецкі гарнізонны касцёл. У 1945-1969 гг. размяшчаліся архіў і база кнігагандлю. Апошняя рэстаўрацыя скончылася ў 1985 г. паводле праекта архітэктара В. Слюнчанкі, пасля чаге, пры- стасаваны пад канцэртную залу з арганам. / 10, 26 /

**Чырвоны мост**

